Дзяржаўная ўстанова культуры
"Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна"
Аддзел маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці

# Каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год

*Мсціслаўскі раён*

Мсціслаў, 2024

Каляндар знамянальных і памятных дат па Мсціслаўскаму раёну на 2025 год / Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка [складальнікС. В. Хмуровіч; адказны за выпуск Н. В. Сідарэнкава]. — Мсціслаў : Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка, 2024.

«Краязнаўчы каляндар» – бібліяграфічнае выданне, якое дапаможа чытачам лепш пазнаць свой край, а бібліятэкарам – прапагандаваць краязнаўчую літаратуру.

Уключаныя ў каляндар знамянальныя і памятныя даты адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, грамадскага, гаспадарчага і культурнага жыцця нашага раёна, дзейнасць выдатных людзей, звязаных з нашым краем.

Да кожнай даты даецца кароткая даведка, указваецца літаратура. У якой часам сустракаюцца і ілюстрацыі.

Матэрыялы каляндара можна выкарыстоўваць пры рэкамендацыі літаратуры чытачам, арганізацыі выстаў літаратуры, для падрыхтоўкі гутарак, аглядаў літаратуры, тэматычных вечароў, папаўнення краязнаўчых картатэк.

Дзяржаўная ўстанова культуры “Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”, 2024 г.

## Знакамітыя людзі

З нагоды юбілеяў знакамітых людзей Мсціслаўшчыны раім аформіць бібліятэчныя выставы, тэматычныя паліцы: “Мой край, мае землякі”, “Шчодрая на таленты зямля”, “Працай не хваляцца, а ганарацца”, “Нашы землякі – наша гордасць”, “Кожны край мае тых, хто яго прадстаўляе” і інш.

Падрыхтаваць мерапрыемствы, гадзіны знаёмстваў, краязнаўчыя гадзіны, урокі пазнавання, урокі бацькаўшчыны, краязнаўчыя вандроўкі на тэмы: “Імя ў гісторыі”, “На таленты багатая зямля”, “Знаёмцеся – наш зямляк”, “ Гонар і слава майго краю”, “Жыццё – працоўны подзвіг”, “Яны абаранялі Радзіму”, “З роднаю зямлей свой лес звязалі”, “Зямля іх наша ўзгадавала”, “Ветэраны жывуць побач” і інш.

## Студзень

### 130 год з дня нараджэння дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, вучонага, кандыдата гістарычных навук, дацэнта Шэкун Алімпіяды Аляксееўны



Нарадзілася 11 студзеня 1895 г. у в. Старае Сяло Мсціслаўскага павета ў сям’і настаўніка. Дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Вучоны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Скончыла Мсціслаўскую гімназію (1912), гісторыка – філасоўскі факультэт Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсаў (1918), Інстытут Чырвонай прафесуры (1932). З 1919 па 1923 г. па партыйнай і савецкай рабоце ў Мсціславе: член паветкама РКП(б), загадчык школьнага пададзела Мсціслаўскага павятовага аддзела народнай асветы, намеснік сакратара партыйнага камітэта, загадчык жаночага аддзела павета.

У 1923–1924 гг. загадчык губернскага аддзела Смаленскага губкама, адначасова выкладчык Смаленскага ўніверсітэта. У маі 1924 г. – дэлегат 13 з’езда РКП(б ). З кастрычніка 1926 па 1929 г. працавала ў апараце ЦК ВКП(б) кіраўніком аддзела па рабоце сярод жанчын. З верасня 1932 г. – старшы навуковы супрацоўнік у рэдакцыі “Гісторыя грамадзянскай вайны”, з студзеня 1933 па 1934 г. – дырэктар вячэрняга факультэта Інстытута чырвонай прафесуры і выкладчык гісторыі ВКП(б) да 1939 г. Дацэнт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, выкладчык са студзеня 1939 па 1941 г. З 1942 г. супрацоўнік аддзела ЦК ВКП(б) па рабоце сярод жанчын. З лістапада 1945 г. – выкладчык Акадэміі навук БССР у Мінску, з 1948 г. – дацэнт кафедры гісторыі СССР у Акадэміі грамадскіх навук у Маскве, з лістапада 1949 г. – дацэнт кафедры гісторыі КПСС у Інстытуце павышэння кваліфікацыі

выкладчыкаў грамадскіх навук пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Аўтар многіх кніг, артыкулаў па выхаваўчай рабоце сярод жанчын, па гісторыі партыі Беларусі.

З 1971 г. – персанальны пенсіянер саюзнага значэння. Узнагароджана медалямі "За працоўную доблесць", "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне", "За доблесную працу".

Памёрла 18 кастрычніка 1979 г.

**Літаратура:**

Шэкун Алімпіяда Аляксееўна : Знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка.-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 544.

## Люты

### 90 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Філіпенкі Раісы Фёдараўны

Нарадзілася 4 лютага 1935 г. у в. Краснае Мсціслаўскага раёна ў сям'і калгасніка. З 1947 г. – калгасніца калгаса "Чырвоны Кастрычнік", затым "26 з'езд КПСС".

У 1973 г. за поспехі і праяўленую працоўную доблесць у выкананні прынятых абавязацельстваў па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, бульбы, цукровых буракоў і іншых прадуктаў земляробства ўзнагароджана ордэнам Леніна.

**Літаратура:**

Філіпенка Раіса Фёдараўна : Узнагароджана ордэнам Леніна // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 508.

### 220 год з дня нараджэння прафесара, Куторгі Сцяпана Сямёнавіча

Нарадзіўся 24/12/ лютага 1805 г. у г. Мсціслаўлі Магілёўскай губерніі. Неглядзячы на тое, што амаль усё яго жыццё прайшло ў Дэрпце і Пецярбургу, ён, разам з братам–гісторыкам, прафесарам Пецярбургскага ўніверсітэта, штогод, пад час летніх канікалаў прыязджаў на радзіму, дзе вёў асветніцкую дзейнасць сярод мясцовага насельніцтва.

Увогуле, Сцяпан Сямёнавіч быў у Расіі адным з нямногіх папулярызатараў навукі сярод шырокіх мас чытаючай публікі. У сярэдзіне 19 ст. у Расіі амаль што не выдавалася навукова-папулярная літаратура, нават

перакладная. С. С. Куторга быў адзіным з нямногіх, працы якога ведалі не толькі вучоныя. Напрыклад, папулярныя нарысы аб шэрагу мясцовасцей Фінляндыі і Карэльскага перашэйка, напісаныя пасля падарожжаў па гэтых мясцінах у 1852–1854 гадах, садзейнічалі масаваму прыезду туды экскурсантаў і пачынаючых даследчыкаў прыроды. Але ж найбольш вядомай навукова–папулярнай працай нашага земляка была “Гісторыя зямной кары”. У канцы 50-х гадоў 19 ст. у Расіі, дзякуючы заезджаму нямецкаму антрыпрынёру, знаёміўшаму ў Імператарскім цырку ў Пецярбургу з геалагічным развіццём Зямлі пры дапамозе чарадзейнага ліхтарыка і вельмі нядрэнных малюнкаў, але дрэннага тэксту, рускія адукаваныя масы загаварылі аб юрскім моры, іхтызаўрах, аб Лапласавай тэорыі паходжання Зямлі. Таму праца пецярбурскага прафесара атрымала свайго чытача і з’явілася першым арыгінальным рускім выкладаннем геалогіі для шырокіх кругоў насельніцтва.

С. С. Куторга зрабіў для развіцця геалогіі нямала. На працягу 20 гадоў (1842-1861 гг.) ён з’яўляўся старшынёй Пецярбургскага мінералагічнага таварыства, заснавальнікам першых рэгулярных выданняў прац таварыства, прафесарам мінералогіі і геалогіі Галоўнага педагагічнага інстытута ў Пецярбургу. Менавіта за гэту працу па геалогіі ён атрымаў свае вышэйшыя ўзнагароды, у тым ліку найбольш ганаровую і ўніверсальную ў тагачаснай Расіі – Дзямідаўскую прэмію ў 1852 г. Гэтай працай з’ўлялася 10-вёрстная геагнастычная карта Пецярбургскай губерніі, якая стала вынікам 10-гадовых даследванняў геалагічнай будовы яе тэрыторыі. Цікава, што складаннем карты С. С. Куторга займаўся ў свой вольны час. 17 сакавіка 1853 г. Савет Імператарскага Рускага Геаграфічнага таварыства прысудзіў за гэту працу сваю вышэйшую ўзнагароду, тады яшчэ адзіную, залатую Канстанцінаўскую медаль. Вельмі высокую адзнаку атрымала карта ў рэцэнзіі першага лаўрэата Канстанцінаўскай залатой медалі Гофмана.

Але ж С. С. Куторга, як пісаў К. Я. Ціміразеў, прадстаўляў сабой “чуть ли не последний экземпляр уже сходившего со сцены типа натуралиста, ссовмещавшего в себе почти все отрасли естествознания”. На заканчэнні ў 1832 г. Дэрптскага (цяпер Тартускага) ўніверсітэта, ён атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны, у Пецярбургскім універсітэце на працягу 28 гадоў (1833-1861) узначальваў кафедру заалогіі, меў званне прафесара заалогіі з 1835 г., з’яляўся членам шматлікіх рускіх і замежных прыродазнаўча-навуковых таварыстваў.

Самай вялікай заслугай С. С. Куторгі лічыцца азнаямленне студэнтаў з эвалюцыйнай тэорыяй Ч. Дарвіна. Гэта здарылася на адной з уводных лекцый агульнага курса заалогіі ў верасні 1860 г. (а кніга Ч. Дарвіна “Паходжанне відаў” выйшла ў лістападзе 1859 г.) ў II аўдыторыі Пецярбургскага ўніверсітэта “со свойственным ему (Куторге С. С. – авт.) мастерством, в ясных, сжатых чертах изложения содержания этой удивительной книги, показывает нам органический мир в совершенно новом свете” – пісаў тады

першакурснік, а потым вядомы вучоны К. А. Ціміразеў. А праз год, 7 мая (25 красавіка) 1861 года прафесара Кутаргі не стала.

## Літаратура:

### Асноўныя навуковыя працы:


Собрание сочинений. Т. 1-2. — СПб., 1984.

Геогностическая карта Петербургской губернии. 1852.

Естественная история земной коры. — СПб., 1858.

Естественная история наливочных животных. — СПб., 1839.

Куторга С. С. Общий взгляд на Таврический полуостров // Журнал Мин-ва нар. просв. — СПб., 1834. — Т. II.

Общий закон появления, существования и исчезновения организмов: Библиотека для чтения. 1850. — Т. 99. — Ч. I.

Описание нескольких новых видов окаменелостей из долины Салгира при Симферополе. — СПб., 1834.

Химические законы образования, разрушения и преобразования минеральных форм. — СПб., 1850.


### Аб жыцці і навуковай дзейнасці:


Куторга С. С. // БелСэ. — Мінск, 1972. — Т. 6.—С. 224.

Куторга С. С.// БСЭ. — 2-е изд. — Масква, 1954. — Т. 24. — С. 144.

Кутарга Сцяпан Сямёнавіч : Звязаў іх лёс з Мсціслаўшчынай // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 80.

Болатаў, А. Сцяпан Кутарга / А. Болатаў // Веснік Магілёва. — 1995. — 2 сакавіка — С. 5.

Куторга С. С. Географы і геолагі – ураджэнцы Магілёўскай вобласці : Бібліяграфічны паказальнік — Магілёў, 1995. — С. 16 — 19.

Дамінікоўскі, Ф. Браты Куторгі / Ф. Дамінікоўскі // Беларусь. — 1946. — № 8. — С. 61 — 62.

Куторга С. С. Караткевіч, У. Мсціслаў / У. Караткевіч. — Мінск, 1985. — С. 52.

Куторга С. С. Тимирязев, К. А. Сочинения. Т. 5 / К. А. Тимирязев. — Москва, 1938. — С. 107 — 108.

Куторга С. С. Ткачоў М. А. Старажытны Мсціслаў / М. А. Ткачоў, А. А. Трусаў. — Мінск., 1992. — С. 63.

Куторга С. С. Фёдорова, В. П. Развитие методики естествознания в дореволюционной России / В. П. Фёдорова. — Москва, 1958. — С. 75 — 76.

Пузыревский, П. Краткий очерк жизни и трудов С. С. Куторги / П. Пузыревский // Записки С. П. Минералогического общества. Сер. 2. 1867. — Ч. 2.

Радзіма Куторгі. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. — Мінск, 1986. — С. 308.

Юрчанка, Г. Нястомны даследчык прыроды : Пра вучонага-прыродазнаўцу С. С. Куторгу / Г. Юрчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1995. — 8 лютага.

**100 год з дня нараджэння доктара філасофскіх навук, прафесара, Галаўнёва Аляксея Іванавіча**



Нарадзіўся 25 лютага 1925 г. у в. Каўшова Мсціслаўскага раёна Калінінскай акругі. Беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1973), прафесар (1974).Удзельнік Вялікай Айчынай вайны. Скончыў БДУ (1950). У 1954–1963 гг. – вучоны сакратар, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права АН БССР. У 1963 –1979 гг. – дацэнт і прафесар кафедры філасофіі АН БССР; у 1979–1981 гг. – загадчык сектара сацыялагічных праблем культуры Інстытута філасофіі і права АН БССР; у 1981–1992 гг. – загадчык кафедры філасофіі АН БССР і прафесар. З 1992 г. – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі. Мае працы па пытаннях гістарычнага матэрыялізму, навуковага камунізма, тэорыі культуры. Узнагароджаны ордэнам Айчынай вайны I ступені, дванаццаццю медлямі.

**Літаратура:**

Галаўнёў Аляксей Іванавіч : Знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 520.

**Сакавік**

**105год з дня нараджэння Заслужанага настаўніка БССР, Лаўрэнавай Анастасіі Анісімаўны**

Нарадзілася 12 сакавіка 1920 г. у в. Сапрынавічы Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. У 1938 г. скончыла Мсціслаўскае педвучылішча, у 1953 г. – Магілёўскі педагагічны інстытут (завочна). Пасля заканчэння педвучылішча працавала настаўніцай у Зорскай сямігадовай школе Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці. З верасня 1944 г. працавала ў Мсціслаўскім раёне: настаўніцай у віхранскай сямігадовай школе, са жніўня 1951 па 1975 г. – настаўніцай геаграфіі ў Астроўскай і Ходасаўскай сярэдніх школах. Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысвоена ў 1967г.

**Літаратура:**

Лаўрэнава Анастасія Анісімаўна : Заслужаныя настаўнікі // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 513.

**95 год з дня нараджэння Заслужанага работніка Вышэйшай школы, Ільіна Віктара Макаравіча**

Нарадзіўся 31 сакавіка 1930 г. у в. Сялец Мсціслаўскага раёна. З 1973 г. рэктар Мінскага радыётыхнічнага інстытута. Званне "Заслужаны работнік Вышэйшай школы" прысвоена ў 1980 г.

**Літаратура:**

Ільін Віктар Макаравіч : Заслужаны работнік вышэйшай школы // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 515.

**Красавік**

**105год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, Жыгунова Уладзіміра Раманавіча**



Нарадзіўся 9.04.1920, у в. Нашковічы (зараз в. Шамаўшчына) Мсціслаўскага раёна. Член КПСС з 1945 г. Скончыў Адэскую авіяцыённую школу пілотаў у 1942 г. З ліпеня 1943 г. на Сцяпным, 2-м і 1-м Украінскім франтах, лётчык-штурмавік. Удзельнік баёў пад Курскам, Харкавам, Палтавай, Крывым Рогам, Кіраваградам, ліквідацыі корсунь-шаўчэнкаўскай групоўкі ворага, Яска-Кішынёўскай аперацыі 1944 г., вызвалення Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, баёў на тэрыторыі Германіі, за Берлін. Камандзір звяна штурмавога авіяпалка, зрабіў 194 баявыя вылеты, збіў 2 самалёты, знішчыў 9 варожых танкаў, 28 аўтамашын, 3 склады, эшалон, заглушыў агонь 3 арт. батарэй. Асабліва вызначыўся ў час ліквідацыі бродскай варожай групоўкі і пры расшырэнні Сандамірскага плацдарма. У 1955 г. скончыў Ваенна-паветраную акадэмію. Да 1960 г. у Савецкай Арміі, палкоўнік.

Прэзідыўм Вярхоўнага Савета ССР Указам ад 27 чэрвеня 1945 г. за мужнасць, адвагу і гераізм прысвоіў Жыгунову Уладзіміру Романавічу званне Героя Савецкага Саюза.

**Літаратура:**

Жыгуноў Уладзімір Раманавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945 : Энцыклапедыя / БеларускаяСавецкая Энцыклапедыя.—Мінск, 1990.—С. 212.

Жигунов В. Р. Герои Советского Союза: краткий биографический словарь в 2-х т. Т. 1.—Москва, 1987.—С. 502.

Жигунов Владимир Романович. Навечно в сердце народном /Справочник.—3-е изд.—Минск,1984.—С. 169 — 170.

Жигунов Владимир Романович // Герои Советского Союза могилевчане. —Минск, 1965. — С. 54 — 55.

Адважны лётчык // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1970. — 22 студзеня.

Анюкоў, М. Быць важаком і абаронцам : аб героях Вялікай Айчыннай Жыгунову, Паўловічу] / М. Анюкоў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1990. — 6 снежня.

Героі – нашы землякі // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1975. — 9 мая.

Грыгор'еў, Ю. "Ілы" ідуць у атаку / Ю. Грыгор'еў // Магілёўская. праўда. — 1981. — 9 мая.

Грыгор'еў, Ю. Слаўны сокал / Ю. Грыгор'еў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1980. — 1 красавіка.

Салаўёў, М. Слаўны сокал / М. Салаўёў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1973. — 5 красавіка.

Салдат нябеснай гвардыі // Магілёўская. праўда. — 1969. — 13 снежня.

**125 год з дня нараджэння дзяржаўнага дзеяча, археолага, мовазнаўца, хіnографа, статыста, Гарэцкага Гаўрылы Іванавіча**



Вядомы далёка за межамі Беларусі акадэмік АН БССР, геолаг, эканоміка-географ, дэмограф, эканаміст, чалавек энцыклапедычных ведаў, Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі нарадзіўся ў в. Малая Багацькаўка (зараз в. Багацькаўка) Мсціслаўскага раёна 10 красавіка 1900 года (брат знакамітага пісьменніка Максіма Іванавіча Гарэцкага).

Пасля таго, як Г. І. Гарэцкі скончыў Пятроўскую (Цімірязеўскую) сельскагаспадарчую акадэмію ў 1924 годзе, ён на парцягу наступнага навучальнага года выкладаў эканамічную геаграфію студэнтам беларускага сектара Маскоўскага Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных

меньшасцей Захаду. Пасля вяртання на любімую горача ім Бацькаўшчыну ў 1926 годзе, ён пачынае працаваць дацэнтам Горы-Горацкай (Горацкай) сельскагаспадарчай акадэміі. У 1927-30 гадах Гаўрыла Іванавіч узначальваў

БелНДІ сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна пры СНК БССР і адначасова быў загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі ў АН БССР. У 28 год Гарэцкі Г. І. стаў акадэмікам Беларускай Акадэміі Навук (пасля АН БССР). У 20-я гады ён актыўна вывучаў насельніцтва Беларусі, нацыянальны склад, пытанні вытворчых сіл рэгіёнаў, эканоміка-геаграфічныя асаблівасці беларускіх губерній.

Плённая праца Гарэцкага – навукоўца неаднаразова перапынялася арыштамі НКУС РСФСР і БССР 1922, 1937, 1938 гадоў. У 1930 годзе Гаўрыла Іванавіч быў рэпрэсіраваны, пазбаўлены звання акадэміка і асуджаны на 10 год пазбаўлення свабоды з высылкай за межы рэспублікі, але ў 1934 годзе быў датэрмінова вызвалены.

З 1931 па 1941 гады Гарэцкі працаваў на розных пасадах у Гідрапраекце СССР. У ваенныя часы Гаўрыла Гарэцкі з’яўляўся галоўным геолагам на абаронных работах у Ржэве і Чарапаўцы, працаваў у геалагічных арганізацыях. У пасляваенныя гады доктар геолага-мінаралагічных навук Гарэцкі, да 1968 года, з’яўляўся галоўным геолагам Гідрапраекта. Пасля таго, як у 1965 годзе ён быў адноўлены ў званні акадэміка АН БССР (рэабілітаваны ў 1958 годзе), пераходзіць на працу ў інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР, у якім у 1969-1985 гг. загадваў аддзелам геалогіі і палеанталогіі атрапагена.

Асноўныя навуковыя даследванні прысвечаны эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі і эканоміцы Беларусі, з аднго боку, і геалогіі антрапагена і інжынернай геалогіі, з другога.

Як эканоміка-географ Г.І. Гарэцкі яшчэ ў 1922 годзе браў удзел у экспідыцыі Наркамзема на Міншчыну і Мазыршчыну па вывучэнню вытворчых сіл. Упершыню, у 1926 годзе, ім былі зроблены комплексныя прыродна-гаспадарчыя апісанні спецыфік рэгіёнаў рэспублікі, накрэсліў шляхі практычнай рэалізацыі канцэпцыі гаспадарчага развіцця “Беларусь – “чырвоная” Данія”.

Як геолаг, Гарэцкі праводзіў даследванні пляцовак пад будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага, Волга-Данскога, Волга-Уральскага каналаў, Горкаўскай, Цымлянскай, Кіеўскай і іншых ГЭС, Салікамскага і Рыбінскага гідравузлоў. Гаўрыла Іванавіч таксама вывучаў геалогію антрапагена Карэліі, Кольскага паўвострава, Прыкам’я, Паволжжа і іншых рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Вывучаў акадэмік Гарэцкі і даліны Пра-Волгі, Пра-Акі, Пра-Дняпра, Пра-Камы... Г. І. Гарэцкі распрацаваў асновы палеапатамалогіі – навукі пра рэкі мінулага. За працы па палеапатамалогіі ён быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР (1971 г.), а за распрацоўку вучэння пра ледавіковыя лагчыны – Дзяржаўнай прэміі БССР (1986 г.).

Акадэмік Гарэцкі ўвайшоў у гісторыю нашай краіны і як дзяржаўны дзеяч, археолаг, мовазнавец, хіnограф, статыст, заснавальнік Таварыства па

вывучэнню Беларусі (БСГА, 1925 г.), беларускай школы даследчыкаў антрапагена (1969 г.). Менавіта ён быў ініцыятарам стварэння Музея валуноў пад адкрытым небам пры ІГІГ АН РБ, што па вуліцы Русіянава ў Мінску.

Акадэмік Гарэцкі ўзнагароджаны Ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Яго імем названы некаторыя выкапнёвыя віды флоры і фаўны. На ўшанаванне памяці Гарэцкага на будынку Інстытута Геахіміі і Геафізікі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Памёр беларускі Ламаносаў ХХ стагодзя 20 лістапада 1988 года ў Мінску.

## Літаратура:

### Асноўныя навуковыя працы:

Бібліяграфія навуковых прац акадэміка АН БССР Г. І. Гарэцкага (да 80-годдзя з дня нараджэння). — Мінск. : Навука і тэхніка, 1980. — 24 с.

Аллювиальная летопись великого Пра-Днепра. — Москва : Наука, 1970. — 490 с.

Аллювий великих антропогеновых прарек Русской равнины. Прареки Камского бассейна. — Москва : Наука, 1964. — 415 с.

Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы // Матэрыялы да геаграфіі і статыстыкі Беларусі. Т. 1. — Мінск, 1928. — С. 1 — 169.

Население Гомельской губернии. Материалы по вопросу районирования Западной области Союза. Вып. 1. Гомельская губерния. — Минск, 1926. — С. 1 — 24.

О некоторых проявлениях унаследования в антропогеновых образованиях Белорусского Понёманья / Стратиграфия и палеография антропогена. — Минск, 1975. — С. 180 — 200.

Особенности палеопотамогии ледниковых областей (на примере Белорусского Понёманья). — Минск : Наука и техника, 1980. — 288 с.

Формирование долины р. Волги в раннем и среднем антропогене. Аллювий Пра-Волги.—Москва: Наука, 1964.—412 с.

### Аб жыцці і навуковай дзейнасці:

Гарэцкі Гаўрыла Іванавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. — Мінск,1994. — С. 493 — 494.

Гарэцкі Г. І. Географы і геолагі – ураджэнцы Магілёўскай вобласці : Бібліяграфічны паказальнік. — Магілёў, 1995. — С. 8 — 11.

Гарэцкі Гаўрыла Іванавіч : Знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 521 — 522.

Горецкий Гавриил Иванович // Возвращённые имена.—Минск, 1992.— С. 33 — 34.

Акадэмік АН БССР Г.І. Гарэцкі // Сцяг Радзімы (Глуск).—1980.— 10 красавіка.

Гарэцкая, Г. Дзяцька Гурык: Успаміны пра Г.І. Гарэцкага/ Г. Гарэцкая // Полымя.—1993.—№1.—С. 160—182. Гарэцкі, Р. Першы арыштант:з жыцця Гарэцкага/ Р. Гарэцкі // Літаратура і Мастацтва.—1993.—3 верасня.—С. 14—15.

Гаўрыла Гарэцкі // Беларуская мова і літаратураў школе.—1990.—№ 4.—С. 62.

Зінава, Р. Чалавек-легенда/ Р. Зінава, Ф. Велічкевіч // Род. прырода.—1990.—№ 3.—С. 10.

Иванова, С. Вровень с веком:о Г.И. Горецком/ С. Иванова // Советская Белоруссия.—1985.—10 апреля.

Иоффе, Э. Не сломили сталинские застенки/ Э. Иоффе // Человек и экономика.—1990.—№ 7.—С. 42—43.

Іоффе, Э. Адзін з 86-ці: 90 год з дня нараджэння Г.І. Гарэцкага/ Э. Іоффе // Звязда.—1990.—10 красавіка.

Іоффе, Э. “Я – беларус упарты, настойлівы”: [Пра Г.І. Гарэцкага]/Э. Іоффе // Навіны беларус. акад.—1992.—24 ліп.—С. 4.

Камарова, Т. Рэкі яго жыцця / Т. Камарова // Звязда. — 1975. — 10 крас.

Ліс, А. Браты Гарэцкія : Старонкі жыццяпісу / А. Ліс // Ліс. А. Песню – у спадчыну : Мастацтвазнаўчыя артыкулы / А. Ліс. — Мн., 1989. — С. 201 — 285.

Ліўшыц, У. Любоў да зямлі / У. Ліўшыц // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1980. — 23 снеж.

Ліўшыц, У. Чалавек шматграннага таленту / У. Ліўшыц // Магілёўс. Праўда. — 1990. — 29 снеж.

Мальдзіс, А Волат : [Памяці Г. І. Гарэцкага] / А. Мальдзіс // ЛІМ.. — 1988. — 25 лістап. — С. 15.

Наркевіч, У. Талент быць чалавекам / У. Наркевіч // Звязда. — 1980. — 10 крас.

Одержимый мечтой // Сов. студент (Горки). — 1980. — 18 дек.

Подзвіг беларускага геолага // Сцяг Радзімы (Глуск). — 1972. — 22 лют.

Содаль, У. Гарэцкія – нашы землякі / У. Содаль // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1979. — 25 студз.

Юрчанка, Г. Кастрычнікам закліканы / Г. Юрчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1978. — 16 мая.

## 110 год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, Вальваценкі Івана Кірылавіча



Нарадзіўся 15.4.1915 у вёскі Мазалава Мсціслаўскага раёна.Член КПСС з 1944 г. у Чырвонай Арміі з 1937 г.

Скончыў танкавую школу ў 1941 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Украіны ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг. У Айчыннаю вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Волхаўскім, Варонежскім, 1-м Украінскім франтах. Удзельнік абароны Львова, Масквы, Ленінграда, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Берлінскай і Пражскай аперацый. Вызначыўся ў баях каля Кіева. 5–6.11.1943 г. танкавая рота на чале з ст. лейтэнантам Вальваценка І. К. прарвала моцную абарону ворага і перарэзала шашу Кіеў – Жытомір. Паранены Вальваценка з экіпажам у падбітым танку некалькі гадзін вёў бой да падыходу падмацавання; экіпаж знішчыў 2 варожыя танкі, 9 цяжкіх гармат, 17 аўтамашын.

Указам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР ад 10 студзеня 1944 года за баявыя подзвігі Вальваценка Івану Кірылавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Да 1946 г. у Чырвонай Арміі, маёр.

## Літаратура:


Вальваценка Іван Кірылавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай Вайне, 1941 – 1945: энцыклапедыя / БеларускаяСавецкая Энцыклапедыя. — Мінск.,1990. — С.114.

Вальваценка Іван Кірылавіч // Памяць : Мсціслаўскі раён : гісторыка.-дакументальные хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 246 — 247.

Вольватенко И.К. Герои Советского Союза: краткий биографичический словарь в 2-х т. Т. 1.—Москва, 1987.—С.286.

Вольватенко Иван Кириллович // Навечно в сердце народном : Справочник. — 3-е изд. — Минск, 1984. — С.103.

Вольватенко Иван Кириллович // Герои Советского Союза могилевчане. — Минск, 1965. — С.44 — 45.

Героі – нашы землякі // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1975. — 9 мая.

Гасянкоў, У. Подзвіг танкіста : пра І. К. Вальваценку / У. Гасянкоў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1992. — 5 жніўня. — С. 2

Гаўрылаў, І. Самы памятны бой : партрэт ветэрана І. К. Вальваценкі. — Святло Кастрычніка. — 1985. — 13 кастрычніка.

Манышаў, М. Расказ героя / М. Манышаў //Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1982. — 3 ліпеня.

Наливайко, И. Склоняю голову перед подвигом : о герое Советского Союза, уроженце Мстиславского района И.К. Вольвотенко/ И. Наливайко // Белоруская Нива. — 1995. — 13 мая. — С. 4

Подзвіг танкіста // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1970. — 21 лютага.

Салаўёў, М. Герой баёў за Кіеў / М. Салаўёў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1972. — 23 снежня.

Салаўёў, М. У баях за Украіну / М. Салаўёў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1978. — 9 мая.

## 100 год з дня нараджэння Заслужанага настаўніка БССР, Сімчанкі Аляксандры Рыгораўны



Нарадзілася 7 мая 1925 г. у Мсціславе. У 1945 г. скончыла Мсціслаўскае педвучылішча, у 1949 г. – Магілёўскі педагагічны інстытут. Працоўную дзейнасць пачала са жніўня 1949 г. у Шамаўскай сярэдняй школе настаўніцай рускай мовы і літаратуры, з 1952 г. – завуч школы, з 1959 г. па 1983 г. – дырэктар школы. У 1965 г. узнагароджана значком “Выдатнік народнай асветы БССР”. У 1968 г. прысвоена званне “Заслужаны настаўнік БССР”. Узнагароджана юбілейным медалём “За працоўную доблесць. У азнаменаванне 100-годзя з дня нараджэння У.І. Леніна”.

### Літаратура:

Сімчанка Аляксандра Рыгораўна : Заслужаныя настаўнікі // Памяць : Мсціслаўскі р-н : Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. — Мн., 1999. — С. 514.

## 90 год з дня нараджэння пісьменніка, Фаміна Уладзіміра Аўрамавіча

Нарадзіўся 20 мая 1935 года ў вёсцы Старынка Мсціслаўскага раёна. У 1953 годзе скончыў Мсціслаўскае педвучылішча, а ў 1964 – Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працаваў у рэдакцыях Быхаўскай і Шклоўскай раённых газет, загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Ленінскага райкома партыі г. Мінска. Супрацоўнічаў у “Мінскай праўдзе”.Скончыў аспірантуру Мінскага педагагічнага інстытута імя М.А. Горкага, выкладчык Мінскага інстытута культуры. Вершы У. Фаміна друкаваліся ў часопісах “Маладосць” і “Беларусь”, у газетах “Літаратура і мастацтва”, “Чырвоная змена”. Першая кніга паэта выйшла ў 1972 г. пад назвай “Падслухаў сэрца”. У 1982 г. з’яўляецца зборнік вершаў “Калі ласка, на святло!”.

### Літаратура:

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Калі ласка, – на святло! : Вершы. — Мінск. : Выдавецтвава ЦК КПБ, 1982. — 47 с. : іл.

Падслухаў сэрца. — Мінск. : Мастацкая літаратура, 1972. — 54 с. — (Першая кніга паэта).

Гіль, М. Споведзь равеснікаў / М. Гіль // ЛІМ. — 1972. — 10 сакавіка. — С. 12.

Скульбедаў, У. Сэрца паэта – людзям / У. Скульбедаў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1972. — 1 красавіка.

**Аб ім:**

Фамін Уладзімір // Пісьменнікі Магілёўшчыны : Бібліяграфічны паказальнік / складальнік : Новікава Н. А., Катлёнак А. А. — Магілёў, 1993. — С. 220 — 221.

## Чэрвень

### 115 год з дня нараджэння Піваварава Зямы Раманавіча

Нарадзіўся 5 чэрвеня 1910 г. у г. Касцюковічы ў сям'і рабочага – шапавала.

Вучыўся ў Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме. Некаторы час быў качагарам у Ленінградзе. У 1934 г. скончыў літаратурны факультэт Вышэйшага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Да 1936 г. працаваў у газеце "Чырвоная змена". Загінуў у час сталінскіх рэпрэсій 14 ліпеня 1938 г.

Першы верш апублікаваў у 1925 г. На пачатку 30-х гадоў друкаваўся ў ленінградскіх часопісах і альманахах. Аўтар зборніка вершаў "Лірыка двух нараджэнняў" (1934), у якім услаўляе працоўны гераізм будаўнікоў сацыялізма. Выступаў у рэспубліканскім друку як тэатральны рэцэнзент.

### Літаратура:

**Аб жыцці і творчасці:**

Півавараў Зяма Раманавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — 1987. — Т.4. — С. 278.

Півавараў Зяма Раманавіч // Пісьменнікі Магілёўшчыны : бібліяграфічны паказальнік : складальнікі : Новікава Н. А., Катлёнак А. А. — Магілёў, 1993. — С. 178.

Зяма Півавараў // пісьменнікі Савецкай Беларусі : кароткі даведальнікі — Мінск, 1981. — С. 277 – 278.

Клімуць, Я. Зяма Півавараў / Я. Клімуць // Магілёўская праўда. — 1993. — 21 красавіка. —(Анталогія літаратурный Магілёўшчыны.)

## 105 год з дня нарджэння Героя Сацыялістычнай працы, Кірычэнкі Кацярыны Іванаўны



Нарадзілася 11 чэрвеня 1920 г. у в. Парфёнава Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям’і. У 1939 г. скончыла Разанскі настаўніцкі інстытут. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. З 1944 г. працавала настаўніцай у Ануфрыеўскай сярэдняй школе Мсціслаўскага раёна.

У 1966 г. за дасягнутыя поспехі ў развіцці народнай асветы і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі ўзнагароджана ордэнам Леніна.

**Літаратура:**

Кірычэнка Кацярына Іванаўна : Узнагароджаныя ордэнам Леніна // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 504.

## Ліпень

## 105 год з дня нараджэння Заслужанага наснаўніка БССР, Урублеўскага Пятра Дзмітрыевіча



Нарадзіўся 10 ліпеня 1920 г. у Мсціславе. Педагагічную дзейнасць пачаў пасля сканчэння Мсціслаўскай сямігадовай школы. У 1936 – 1941 гг. працаваў выхавацелям дзіцячых дамоў Мсціслава. Працу сумяшчаў з вучобай у Мсціслаўскім педвучылішчы. У 1941 г. разам з іншымі супрацоўнікамі дзіцячага дома арганізаваў эвакуацыю дзяцей у Цемнікаў Мардоўскай АССР. Працаваў выхавацелем, намеснікам дырэктара па вучэбна–выхаваўчай рабоце ў рамесным вучылішчы і дзіцячай калоніі ў Цемнікаўскім раёне. З 1944г. – дырэктар, выхавацель Мсціслаўскага дзіцячага дома, з 1951 па 1 ліпеня 1980 г. – выхавацель школы глухіх дзяцей. Узнагароджаны значком “Выдатнік народнай адукацыі БССР”.Званне “Заслужаны настаўнік БССР” прысвоена ў 1967 г.Памёр 11 кастрычніка 1995 г.

**Літаратура:**

Урублеўскій Пётр Дзмітрыевіч : заслужаныя настаўнікі // Памяць : Мсціслаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск., 1999. — С. 514 — 515.

## Жнівень

### 95 год з дня нараджэння Заслужанага настаўніка БССР, Паплаўскай Таццяны Пятроўны

Нарадзілася 1 жніўня 1930 г. у в. Васільеўка Гомельскага раёна. У 1949 г. скончыла Пінскае педвучылішча, у 1953 г. – Гомельскі педагагічны інстытут. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Янавічскай сярэдняй школе Суражскага раёна Віцебскай вобласці. Са жніўня 1955 г. працавала завучам пачатковых класаў сярэдняй школы №1 Мсціслава, з 1966 г. –намеснікам дырэктара па вучэбна–выхаваўчай рабоце. Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысвоена ў 1967 г. Узнагароджана дзвюма Ганаровымі граматамі Міністэрства асветы БССР, медалём "За працоўную доблесць".

**Літаратура:**

Паплаўская Таццяна Пятроўна : Заслужаныя настаўнікі // Памяць : Мсціслаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 513.

### 90 год з дня нараджэння доктара філалагічных навук, прафесара, акадэміка Акадэміі навук Беларусі, Падлужнага Аляксандра Іосіфавіча



Нарадзіўся 16 жніўня 1935 г. у в. Залессе Мсціслаўскага раёна. У 1954 г. скончыў Мсціслаўскае педвучылішча, у 1959 г. – адзяленне беларускай мовы і літаратуры Белдзяржуніверсітэта. Доктар філалагічных навук (1982), прафесар (1989), акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1994). Настаўнічаў. З 1962 г. – у інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа АН Беларусі.

А. І. Падлужны – аўтар больш чым 60 навуковых прац па розных праблемах беларускай фанетыкі і фаналогіі, сучаснай беларускай лексікаграфіі, граматыкі, правапісу і культуры мовы. Ён стварыў у Інстытуце мовазнаўства лабараторыю эксперыментальнай фанетыкі, у якой праведзены даследванні вуснай беларускай мовы. А. І. Падлужны ўпершыню даследаваў фанемны склад беларускай мовы і разгледзіў механізм функцыяніравання

гукаў, які не паддаецца непасрэднаму назіранню. Гэта даследванне паслужыла тэарытычнай асновай для эксперыментальнага вывучэння гукаў беларускай мовы.

Значнае месца ў навуковай дзейнасці вучонага займаюць праблемы нармалізацыі беларускага літаратурнага маўлення.

## Літаратура:

### Асноўныя навуковыя працы:


Беларуская лінгвістыка / рэдактар А. І. Падлужны. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972 ; Выпуск 44. — 1994. — 87 с.

Беларуская мова : Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / пад рэдакцыей А. І. Падлужнага. — Мінск. : Навука і тэхніка, 1987. — 144 с.

Кривицкий, А. А. Белоруский язык для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А. И. Подлужный. — 3-е изд., перераб. — Мінск. : Вышэйшая школа, 1990. — 368 с.

Крывіцкі, А. А., Падлужны, А. І. Практыкум па фанетыцы беларускай мовы / А. А. Крывіцкі, А. І. Падлужны. — Мінск. : Вышэйшая. школа 1989. — 221 с. : іл.

Пытанні культуры пісьмовай мовы / Пад рэд. А. І. Падлужнага. — Мн. : Народная асвета, 1991. — 175 с.

Арашонкава Г. У., Лемцюгова В. П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Пад рэд. М. В. Бірылы, А. І. Падлужнага. — Мінск : Вышыйшая школа, 1986. — 210 с.

Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / А. І. Падлужны і іншыя. — Мінск : Навука і тэхніка, 1989. — 334 с.

Беларускае мовазнаўства : Бібліягр. паказ. (1966 – 1975) / складальнік А. Д. Васілеўская, Я. М. Рамановіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1980. — 350 с.

Беларускае мовазнаўства:бібліяграфічны паказальнік (1976 – 1985)/ Склад. А.Д. Васілеўская, Я.М. Рамановіч.—Мінск, 1993.—559 с.


### Аб жыцці і навуковай дзейнасці:


Падлужны А. І. // Беларуская мова : энцыклапедыя. — Мінск, 1994. — С. 397 — 398.

Падлужны А. І. // Беларусь : энцыклапедны. даведнік. — Мінск, 1995. — С.548 — 549.

Падлужны А. І. // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 4. — Мінск, 1987. — С. 136 — 137.

Падлужны А. І. // Мовазнаўцы Магілёўшчыны : бібліяграфічны паказальнік — Магілёў, 1998. — С. 52 — 53.

Падлужны Аляксандр Іосіфавіч : Знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 537.

Падлужны А. І // Хто ёсць хто ў сучаснай беларускай лінгвістыцы / рэдкалегія : А. К. Кіклевіч, У. Б. Журавель. — Мінск, 1997. — С. 79.

Аб роднай мове і толькі аб ёй... // Навіны АН Беларусі. — 1995. — 18 жніўня. — С. 2.

Выгонная, Л. Ц. Аляксандр Іосіфавіч Падлужны / Л. Ц. Выгонная // Беларуская лінгвістыка. Выпуск 28. — Мінск, 1985. — С. 76 — 77.

Русак, В. П. Аляксандр Іосіфавіч Падлужны / В. П. Русак // Весці АН Беларусі. — 1995. — № 3. — С. 123 — 126.

Юрчанка, Г. Грані гукаў / Г. Юрчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1978. — 8 ліпеня.

Юрчанка, Г. У росквіце творчых сіл / Г. Юрчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1994. — 16 сакавіка.

Юрчанка, Г. Акадэмік-сакратар родам з Мсціслаўшчыны / Г. Юрчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1997. — 30 ліпеня.

## 105 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Іванова Фёдара Рыгоравіча



Нарадзіўся 25 жніўня 1920 г. у в. Краснае Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям’і. Скончыў 5 класаў Ходасаўскай сямігодкі. З 1936 г. працаваў у калгасе “Чырвоны Кастрычнік”. У верасні 1940 г. прызваны ў Савецкую Армію. З першых дзён вайны на фронце, трапіў у палон і са жніўня 1941 па сакавік 1945 г. знаходзіўся ў Германіі. З сакавіка 1945 г. зноў у Савецкай Арміі ў 197-ым армейскім і 163-ім гвардзейскім стралковым палку, камандзір аддзялення.

Узнагароджаны медалямі “За ўзяцце Берліна”, “За перамогу над Германіяй”.

Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. працаваў на радзіме калгаснікам, з 1962 г. – даярам, з 1966 г. па 1975 г. – загадчыкам малочнатаварнай фермы. З 1975 г. па стану здароўя працаваў радавым калгаснікам.

За поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака і іншай прадукцыі ўзнагароджаны ордэнам Леніна (1966).

**Літаратура:**

Іваноў Фёдар Рыгоравіч: Узнагароджаныя ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: гісторыка.-дакументальнця хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 503.

**Лістапад**

**115 год з дня нараджэння Беларускага савецкага паэта, Астапенкі Змітрака ( Дзмітрый Емельянавіч)**

Беларускі савецкі паэт, нарадзіўся 10.11.1910 г. у вёскі Калеснікі Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, у сям'і настаўніка.

У 1929 г. скончыў Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісах. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у Савецкай Арміі, быў на фронце.

Загінуў у кастрычніку 1944 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1926 г. Выйшлі зборнікі паэзіі "На ўсход сонца" (1931), "Краіна" (1931), "Абураныя" (1932), "Выбранае" (1957), "Вершы і паэмы" (1968), кніжка – малюнак для дзяцей "Трактар" (1933).

Напісаў навукова – фантастычны раман "Вызваленне сіл" ("Маладняк", 1932). Пераклаў раманы М. Горкага "Маці" (1932), Л. Первамайскага "Ваколіцы" (1931), разам з М. Багунам, творы іншых рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці :**

Астапенка Змітрок Емельянавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. — 1984. — Т. 1. — С. 207 — 208.

Астапенка Змітрок // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т. 1. — Мінск, 1992. — С. 114 — 116.

Астапенка Змітрок // Пісьменнікі Магілёўшчыны : бібліяграфічны паказальнік / складальнік : Новікава Н. А., Катлёнак А. А. — Магілёў, 1993. — С. 9 — 11.

Змітрок Астапенка // Пісьменнікі Савецкай Беларусі : кароткі даведнік. — Мінск, 1981. — С. 20.

Змітрок Астапенка // Ішла вайна народная... : беларускія пісьменнікі ў Вялікай Айчыннай. — Мінск, 1991. — С. 40 — 42.

Змітрок Астапенка // Радзіме – радок і жыццё. — Мінск, 1986. — С. 14 — 16.

Бечык, В. Радзіме – радок і жыццё :  пра беларускіх паэтаў, загінуўшых на вайне, у тым ліку пра З. Астапенку] / В. Бечык // Бечык, В. Прад высокаю

красою... : Літ.- крытыч. артыкулы / В. Бечык — Мінск, 1984. — С. 175 — 183.

Войценкаў, М. З тых, хто застаўся на вайне / М. Войценкаў // Літаратура і Мастацтва. — Мінск. — 1980. — 14 лістапада. — С. 14.

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры : вучэбны дапаможнік для філала факультатіва універсітаў. Ч. 1 / С. А. Андранюк, М. М. арсток, Д. Я. Бугаёў і інш. — Мінск. : Вышэйшая школа, 1981. — 382 с. З.

Грахоўскі, С. Я цябе, Радзіма, у дні суровыя збярог! / С. Грахоўскі // Маладосць. — 1985. — № 5. — С. 4.

Клімуць, Я. Змітрок Астапенка / Я. Клімуць // Магілёўская праўда. — 1989. — 16 снежня. — (Анталогія літ. Магілёўшчыны).

Клімуць, Я. Самабытны талент / Я. Клімуць // Чырв. Сцяг (Краснаполле). — 1985. — 12 лістапада.

Маналог : памяці паэтаў З, Астапенкі і Ю. Таўбіна // Куляшоў, А. Маналог : Вершы. Паэмы / А. Куляшоў. — Мінск, 1989. — С. 9.

Марціновіч, А. “У нас сэрцы чыстыя...” : новае пра Зм. Астапенку / А. Марціновіч // Літаратура і МастацтваМ. — 1992. — 3 студзеня. — С. 13 — 14.

Марціновіч, А. Права на працяг / А. Марціновіч // Полымя. — 1985. — № 11. — С. 209 — 213.

Пруднікаў, П. Паэт – воін / П. Пруднікаў // Настаўнаўніцкая газета. — 1985. — 7 лістап.

Пруднікаў, П. Са славутай мсціслаўскай кагорты [паэт З. Астапенка]/ П. Пруднікаў // Пруднікаў, П. Далёкае, але не забытае : Успаміны / П. Пруднікаў. — Мінск, 1988. — С. 137 — 142.

Пруднікаў, П. Са славутай мсціслаўскай кагорты / П. Пруднікаў // Магілёўс. праўда. — 1985. — 21 лістапада.

Скрыган, Я. Рэквіем // Скрыган, Я. Некалькі хвілін чужога жыцця / Я. Скрыган. — Мінск, 1979. — С. 137 — 143.

Шушкевіч, С. Лёс паэта // Шушкевіч, С. Вяртанне ў маладосць : Успаміны і нататкі / С. Шушкевіч. — Мінск, 1968. — С. 114 — 121.

Юлька, І. Змітрок // Лужанін М. Трое: Аповесці, апавяданні, эсэ / М. Лужанін. — Мінск, 1989. — С. 389 — 394.

Янішчыц, Я. Славацкі снег : верш, прысвечаны З. Астапенку / Янішчыц, Я. Дзень вечаровы : лірыка / Я. Янішчыц. — Мінск, 1974. — С. 50.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Лойка, А. Цікавая старонка нашай паэзіі / А. Лойка // Літаратура і Мастацтва . — 1958. — 8 студз. — С. 3.

Шавня, А. Во имя “тысячи вёсен” / А. Шавня // Советская Белоруссия. — 1958. — 19 янв.

Вершы і паэмы : складальнік і аўтарартыкула С. Шушкевіч. — Мінск. : Беларусь, 1968. — 122 с. — (Бібліятэка беларускай паэзіі)

Рэц. : Барута, Р. Істотнае гаварыць проста / Р. Барута // Літаратура і Матацтва. — 1968. — 29 лістапада. — С. 3.

Макаль, П. Слова належыць жыццю / П. Макаль // Полымя. — 1969. — № 5. — С. 238 — 240.

Пад шум даджу : Вершы, паэмы, лісты. — Мінск. : Мастацкая літаратура., 1991. — 279 с.

Вершы // Крывёю сэрца. — Мінск, 1967. — С. 11 — 35.

Мост в будущее : Стихи : Перевод с белорускогоИ. Бурсова // Возвращение. — Минск, 1985. — С. 10 — 20.

На белым пагорку : Паклянёмся любіць наш край!.. : Вершы // За цябе Радзіма! : Вершы беларускіх паэтаў. — Мінск, 1984. — С. 40 — 41.

Эдем : Отрывки из поэмы: Перевод с белорусского Д. Хмелевский// Дружба народов.—1961.—№6.—С. 72 — 79.

Стихи и поэма "Эдем" : Перевод с белорусского Д. Ковалёва, Я. Хелемского // Кровью сердца .— Минск, 1985. — С. 9 — 47.

## Снежань

### 115 год з дня нараджэння партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Літоўскай ССР, доктара эканамічных навук, Манюшыса Іосіфа Антонавіча

Нарадзіўся 12 снежня 1910 г. у в. Малькаўка Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Партыйны і дзяржаўны дзеяч Літоўскай ССР, доктар эканамічных навук. Скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум (1931). Потым – на педагагічнай працы ў Лёзненскім раёне Віцебскай вобласці. У 1932 –1938 гг. вучыўся ў Ленінградскім аўтадарожным інстытуце. З 1938 г. працаваў у Ленінградзе і на Украіне інжынерам-канструктарам і старшым інжынерам. Удзельнік Айчынай вайны. У 1941 –1942 гг. – інжынер штаба 135-га асобнага дарожна – будаўнічага батальёна 23-яй Арміі Ленінградскага фронту. У 1942 –1944 гг. – камандзір сапёрнага ўзвода і начальнік інжынернай службы 2-га асобнага запаснога батальёна г. Балахна Горкаўскай вобласці. У 1944-1947 гг. старшыня планавай камісіі, намеснік старшыні Вільнюскага гарвыканкама, з 1947 г. – старшыня Каўнаскага гарвыканкама. У 1950 – 1954 гг.- міністр жыллёва–грамадзянскага будаўніцтва Літоўскай ССР, з 1954 г. – міністр гарадскога і сельскага будаўніцтва Літоўскай ССР. У 1955-1967 гг. – сакратар ЦК кампартыі Літвы, старшыня бюро ЦК КП Літвы па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтву, з 1967 па 1981 г. – старшыня Савета Міністраў Літоўскай ССР, з 1981 па 1987 г. – дырэктар Інстытута эканомікі АН Літоўскай ССР. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюоцыі, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, "Знак Пашаны ", дзесяццю медалямі.

Памёр 17 сакавіка 1987 г.

**Літаратура:**

Манюшыс Іосіф Антонавіч : Знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі р-н : Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. — Мн., 1999. — С. 534.

## 100 год з дня нараджэння доктара тэхнічных навук, прафесара, удзельніка Вялікай Айчынай вайны, Улазоўскага Усевалада Аляксандравіча



Нарадзіўся 14 снежня 1925 г. у Мсціславе. Вучоны-даследчык у галіне тэхналогіі будаўнічых матэрыялаў. Доктар тэхнічных навук, прафесар, удзельнік Вялікай Айчынай вайны з 1945 г.

Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1951). З верасня 1951 г. працаваў на Гомельскім шклозаводзе інжынерам-тэхнолагам. З 1954 г. адначасова працягваў вучобу ў завочнай аспірантуры Беларускага політэхнічнага інстытута. У 1957 г. абараніў дысертацыю на прысваенне звання кандыдата тэхнічных навук.

У 1957–1958 гг. працаваў галоўным спецыялістам па шкляной прамысловасці Дзяржаўнага навуковатэхнічнага камітэта Савета Міністраў БССР, старшым інжынерам, потым намеснікам начальніка аддзела тэхналогіі будаўнічых матэрыялаў навукова-тэхнічнага камітэта СНГ СССР.

З кастрычніка 1958 г. – у Волгаградскім інжынерна-будаўнічым інстытуце: загадчык кафедры будаўнічых матэрыялаў, з 1959 г. – дацэнт, з 1962 г. – прарэктар інстытута па навуковай рабоце. З 1975 г. – доктар тэхнічных навук, з 1977 г. – прафесар кафедры. З кастрычніка 1984 г. – загадчык кафедры будаўнічых матэрыялаў, з верасня 1989 г. – прафесар кафедры. Апублікаваў 103 навуковыя працы, атрымаў 7 аўтарскіх пасведчанняў. Асноўныя працы прысвечаны павышэнню трываласці элементаў, а таксама ўплыву розных неарганічных салявых раствораў і хімічных рэчываў на якасці цэменту.

Узнагароджаны ордэнамі Айчынай вайны I ступені , “Знак Пашаны”, медалём “За адвагу” і інш.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У. Л. Улазоўскі Усевалад Аляксандравіч : Знакамітыя людзі / У. Л. Гасянкоў // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 514 — 515

**100 год з дня нараджэння члена-карэспандэнта АН БССР, доктара юрыдычных навук, прафесара, удзельніка Вялікай Айчынай вайны, Семянкова Віктара Іванавіча**



Нарадзіўся 26 снежня 1925 г. у в. Гімбатаўка Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Член – карэспандэнт АН БССР (1980), доктар юрыдычных навук (1974), прафесар. Удзельнік Вялікай Айчынай вайны.

У 1950–1954 гг. вучыўся ў Мінскім юрыдычным інстытуце. Са жніўня 1954 г. стажыраваўся ў Гродзенскім абласным судзе, а ў снежні быў выбраны народным суддзёй Зельвенскага раёна. З 1958 г. вучыўся ў аспірантуры Аддзела прававых навук АН БССР па спецыяльнасці "Савецкае працоўнае права", а ў 1962 г. абараніў дысертацыю і атрымаў вучоную ступень кандыдата юрыдычных навук. Працаваў у аддзеле прававых навук, а затым у Інстытуце філасофіі і права АН БССР малодшым навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам, з 1972 г. загадчыкам сектара гаспадарчага і працоўнага права, з 1983 г. – намеснік дырэктара інстытута па навуковай рабоце.

У працах В.І. Семянкова атрымалі навуковае абгрунтаванне праблемы савецкага працоўнага права. Як аўтар і рэдактар ён прыняў удзел у выданнях: "Законодательство о труде", "История государства и права", навукова-арактычны каментарый КЗАП БССР. Усяго ім апублікавана каля 100 прац.

Узнагароджаны ордэнамі Айчынай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, "Знак Пашаны" , медалямі.

**Літаратура:**

Семянкоў Віктар Іванавіч : Знакамітыя людзі // Памяць : Мсціслаўскі р-н : Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. — Мінск., 1999. — С. 539 — 540.

Сідарэнка, Л. Служэнне справядлівасці : Віктар Іванавіч Семянкоў – выдатны вучоны, настаўнік / Ларыса Сідарэнка // Святло Кастрычніка. – 2019. – № 65. – 4 верасня. – С. 5.

## 105 год з дня нараджэння савецкага скрыпача і дырыжора, Афанасьева Барыса Ігнатавіча



Нарадзіўся ў 1920 годзе, ў Мсціславе. Савецкі скрыпач і дырыжор. У 1947 г. скончыў Беларускаю кансерваторыю па класу скрыпкі. З 1944 г. працуе ў Беларускай філармоніі. З 1960 г. – галоўны дырыжор Пермскага, з 1976 г. Адэскага тэатраў оперы і балета. Як дырыжор вызначаецца эмацыянальнасцю, валявой імпульсіўнасцю, прыўзнятасцю выканання. Актыўны прапагандыст беларускай музыкі. Шмат выступаў як скрыпач-ансамбліст (у прыватнасці, удзельнічаў у выкананні ўсіх беларускіх квартэтаў 40-50-х гг.).

### Літаратура:

Барыс Ігнатавіч Афанасьеў // Энцыклапедыя. літтаратуры і мастацтва Беларусі. — 1984. — Т. 1. — С. 227 — 228.

Борис Игнатьевич Афанасьев // Музыкальная энцыклопедия. — Москва, 1982. — Т. 6. — С. 667.

Афанасьеў Барыс Ігнатавіч // Выдатныя дзеячы музычнага мастацтва Магілёўшчыны : Біябібліягр. паказ. ; Склад. Цыбулёва Н. М. — Магілёў, 1994. — С.5.

Гісторыя беларускай савецкай музыкі. — Мінск : Вышэйшая школа, 1971. — 544 с.

История белорусской музыки. — Москва : Музыка, 1976. — 247 с. : ноты.

## 100 год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, Крываносава Ільі Макаравіча

Нарадзіўся ў 1925 г. у в. Міхайлаўск Мсціслаўскага раёна ў сям’і калгаснікаў. У 1938 г. скончыў 7 класаў. Працоўную дзейнасць пачаў у 1939 г. памошнікам загадчыка млына ў калгасе імя Варашылава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з 1944 г. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. працаваў брыгадзірам у саўгасе “Мсціслаўскі”. З 1978 г. – рабочы будаўнічай брыгады гэтага саўгаса.

У 1971 г. за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананне пяцігадовага плана па продажу прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Памёр 30 сакавіка 1966 г.

**Літаратура:**

Крываносаў Ілья Макаравіч : узнагароджаныя ордэнам Леніна // Памяць : Мсціслаўскі р-н : Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі. — Мн., 1999. — С. 505.

## 100 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Леўсавай Анастасіі Фёдараўны

Нарадзілася ў 1925 г. у в. Беразуйкі Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1941 г. скончыла 7 класаў Ануфрыеўскай сярэдняй школы. З 1943 г. – калгасніца калгаса "10 з'езд партыі". З 1955 г. звенневая па вырошчванні льну, тэхнічных і прапашных культур калгаса імя Чапаева. Звяно якое яна ўзначальвала, з года ў год дабівалася высокіх паказчыкаў па вырошчванні льну і цукровых буракоў.

У 1966 г. за высокія паказчыкі ў вырошчванні льну і цукровых буракоў узнагароджана ордэнам Леніна, Граматай Вярхоўнага Савета БССР (1974), медалём "Ветэран працы" (1980). Удзельніца ВДНГ СССР (1966, 1968).

**Літаратура:**

Леўсава Анастасія Фёдараўна : узнагароджаныя ордэнам Леніна // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка.-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 505.

## 185 год з дня нараджэння вучонага-гісторыка, перакладчыка, Прахава Мсціслава Віктаравіча

Вучоны-гісторык, перакладчык. Нарадзіўся ў 1840г. у г. Мсціслаў Магілёўскай губерні. Вырас у дваранскай сям'і і атрымаў адпаведнае выхаванне і падрыхтоўку да паступлення ў Мітаўскую класічную гімназію. Ёсць меркаванне, што пазней вучыўся і ў Пецярбургскай гімназіі. Бліскуча скончыў у 1863 г. гісторыка-філагічны факультэт Пецярбугскага ўніверсітэта. Адзначаны яго высокія веды грэчаскай лацінскай, нямецкай і рускай моў. Праявіў самастойнасць у засваенні гісторыі, славянскай філалогіі, логікі, псіхалогіі. Вучоная камісія Пецярбургскага ўніверсітэта прызнала яго выпускную працу вартай пачэснай ступені кандыдата гістарычных навук. Мсціслаў Віктаравіч адразу ж быў зацверджаны папячыцелем Санкт-Пецярбургскай вучэбнай акругі і па грамадзянскай службе аднесены ў разрад чыноўнікаў дзесятага класа.

Есць звесткі, што ненадоўга М. В. Прахаў адпраўляўся ва "унутраныя губерні Расіі", а пасля з мэтай удасканалення сваіх ведаў, ездзіў за мяжу. Колькі часу прабыў і дзе — невядома. Вярнуўся ў Пецярбург, жыў і працаваў тут да 1876 г. Потым пераязджае ў Дэрпт, уладкоўваецца ва універсітэт

выкладчыкам и зацвярджаецца на пасадзе дацэнта рускай мовы і славеснасці. Тут акрамя чытання лекцый і практычных заняткаў са студэнтамі М. В. Прахаў захапіўся праблемай “Помнікі мінулай гісторыі ў старажытнай рускай літаратуры”, пачынаючы са “Слова пра паход Ігараў”. Працягваў работу па складанні “Старажытнарускай граматыкі”.

У часы адпачынку захапіўся перакладамі з нямецкай мовы, найперш Г. Гейне, а таксама персідскіх песень і інш. Бываў малады дацэнт і дома, у родным Мсціславе, дзе праводзіў археалагічныя раскопкі, шукаючы пацвярджэнне сваіх навуковых высноў у розных пісьмовых крыніцах. Справы ў Прахава ішлі ладам. Былі здабыткі навуковай дзейнасці. Аднак вучоны энтузіяст моцна захварэў. 24 сакавіка 1878 г. вучоны саветам Юр’еўскага (Дэрпцкага) ўніверсітэта большасцю галасоў ён на тры месяцы быў зволены для лячэння. Далейшы яго лёс застаўся невядомы.

## Літаратура:

Гасянкоў, У. Л. Прахаў Мсціслаў Віктаравіч : звязаў іх лёс з Мсціслаўшчынай / Гасянкоў У. Л. // Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1999. — С. 81 — 82.

**890 гадоў з часу заснавання г. Мсціслаўля (1135)**

**З гісторыі вёсак**

З нагоды юбілеяў вёсак раім аформіць бібліятэчныя выставы, тэматычныя паліцы на тэмы: “Гісторыя і сучаснасць роднага краю”, “Ён Радзімаю завецца-непаўторны гэты край”, “Край, дзе мы жывём”, “Каранямі я з роднай зямлі”, “Вёска, у якой я жыву”, “Зямля бацькоў – жыцця крыніца”, “Зямля, дзе пачаўся наш лёс”, “Вёска мая, я часцінка твая”, “Непаўторная, адзіная, малая Радзіма”, “Зямля бацькоў – зямля святая”, “Я вырас тут, і край мне гэты любы” і інш.

Падрыхтаваць мерапрыемствы, гадзіны знаёмстваў, краязнаўчыя гадзіны, урокі пазнання, урокі бацькаўшчыны, краязнаўчыя вандроўкі на тэмы: “Знакамітыя людзі нашай вёскі”, “Ці ведаеш ты сваю вёску?”, “За што я люблю сваю вёску”, “Тут табе пашчасціла жыць і нарадзіцца”, “ Наша малая радзіма-роднае сяло”, “Мой родны, мілы край”, “Край бацькоўскі – мая глабінка”, “Наша вёска раней і зараз”, “Зямля іх наша ўзгадавала” і інш.

**БЕСКАКОВА –** вёска ў Мазалаўскім с/с, за 14 км на ПдЗ ад Мсціслава, 89 км ад Магілёва, 7 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша-Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1690 г., калі была куплена Мсціслаўскім кармеліцкім кляштарам. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1798 г. вёска і аднайменны фальварак налічвалі 32 жыхары мужчынскага полу. У 1828 г. с. Бесканаў, 9 двароў. У 1880 г. 14 двароў, 76 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., 21 двор, 149 жыхароў. Непадалёку знаходзілася аднайменная сядзіба (1двор, 7 жыхароў). У 1909 г. ў сяле 25 двароў, 188 жыхароў, у фальварку 1 двор, 6 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў БССР. У 1925 г. адкрыта школа, у якой у 1927 г. было 40 вучняў. У 1931 г. арганізаваны калгас “Свабода”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 14 гаспадарак, меў 77 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 33 двары, 172 жыхары, да вёскі далучана в. Кучкаўшчына. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У вер. 1943 г. гітлераўцы спалілі 28 двароў. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 18 гаспадарак, 45 жыхароў, у складзе калгаса “60 гадоў БССР” (цэнтр – в. Мазалава). У 2007 г. ў СВК “Мазалаўскае”. Зараз у скалдзе ААТ “Мазалаўскае”

На 01.01.2024 насельніцтва складае 1 чал.

**ВАЛОЎНІКІ** – вёска ў Мушынскім с/с, за 24 км ПдЗ ад Мсціслава, 83 км ад Магілёва, 7 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша-Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 19 ст. Памешчык меў у 1840 г. 310 дзес. зямлі і вадзяны млын. У 1847 г. ў Чэрыкаўскім павеце, вёска (7 двароў, 54 жыхары) і фальварак (2 двары, 9 жыхароў), уласнасць памешчыка. У 1858

г. 23 двары, 182 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. вёскі Валовікі 1 (48 двароў, 362 жыхары) і Валовікі 2 (8 двароў, 43 жыхары). Побач быў аднайменны фальварак (2 двары, 9 жыхароў). У 1900 г. адкрыта царк.-прыходская школа. У 1909 г. ў Маляціцкай вол. Чэрыкаўскага павета у в. Валоўнікі 1-56 двароў, 365 жыхароў, школа граматы, у в. Валоўнікі 2-35 двароў, 204 жыхары. Побач былі 2 фальваркі (2 двары, 21 жыхар). З 1-й ступені, у якой у 1926 г. былі 82 вучні. У 1931 г. арганізаваны калгас "Ударнік", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 99 гаспадарак, меў 485 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана мелася кузня. У 1930-я гг. вёскі Валоўнікі 1 і Валоўнікі 2 былі аб'яднаны ў адну в. Валоўнікі. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 115 двароў, 436 жыхароў, да вёскі далучаны пас. Калбаскі, вёскі Круча, Кулікоўская, Чвёрткі, Сасноўка. У Вял. Айч. вайну з 15.07.1941 г. да 03.10.1943 г. вёска акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў жн.-вер. 1943 г. спалілі 80 двароў. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 78 гаспадарак, 185 жыхароў, у складзе саўгаса "Перамога" (цэнтр – в. Мушына). Працавалі пач. школа, фельч.-акушэрскі пункт. У 2007 г. ў СВК "Мушына".

На 01.01.20124 насельніцтва складае 26 чал.

**ДОЎГАВІЧЫ** - вёска ў Ракшынскім с/с, за 33 км на ПдЗ ад Мсціслава, 78 км ад Магілёва, 14 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша-Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 17 ст. У 1635 г. с. ў Пуцькаўскім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзярж. Ўласнасць. Дзейнічалі млын і карчма. У 1742 г. сяло Доўгавічы (яно ж Парапшы) у Пуцькаўскім войтаўстве Магілёўскага староства-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяв. ВКЛ, 45 двароў, царква, млын, карчма, дзярж. ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1777 г. сяло ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губ. У 1816 г. ў Чэрыкаўскім павеце, 86 двароў, 466 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1848 г. 93 двары, дзейнічала дараўляная царква. У 1870 г. адкрыта школа (нар. вучылішча), у якой у 1889 г. навучаліся 41 хлопчык і 3 дзяўчынкі. У 1886 г. цэнтр воласці Чэрыкаўскага павета, 73 двары, 487 жыхароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся сталярным промыслам. Паводле перапісу 1897 г. 113 двароў, 722 жыхары, школа, хлебазапасны магазін, карчма, багадзельня, 2 вадзяныя млыны, царква; 2 разы ў год праводзіліся кірмашы. У 1909 г. 135 двароў, 727 жыхароў, пабудавана памяшканне для школы. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэв. створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 87 вучняў. З 20.08.1924 г. ў Расненскім р-не Калінінскай акругі, цэнтр Доўгавіцкага с/с. У 1924 г. адкрыта прац. школа 1-й ступені, пачалі дзейнічаць хата-чытальня, б-ка, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 156 двароў, 882 жыхары. З 09.06.1927 г. ў складзе Аршанскй акругі, з 26.07.1930 г. ў Расненскім, з 25.07.1931 г. ў Мсціслаўскім р-нах. У 1930 г. арганізавана камуна, а ў 1931 г. – калгас "Ударнік", які ў

1932 г. аб’ядноўваў 75 гаспадарак, меў 391 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана. У 1937 г. пабудавана новае памяшканне для 7-гадовай школы. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. З 1939 г. працаваў клуб. У Вял. Айч. вайну з 10.07.1941 г. да 29.09.1943 г. вёска акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. На ўшанаванне памяці 178 землякоў, якія загінулі на фронце і ў партыз. барцьбе, у 1965 г. ў цэнтры вёскі пастаўлена стэла. У 1990 г. 201 гаспадарка, 466 жыхароў, цэнтр калгаса “Ударнік”. Працавалі сярэдняя школа (16 настаўнікаў), б-ка, бальніца, аптэка, дзіцячы сад-яслі, аддз. сувязі, гандл. цэнтр, аўтаматычная тэлеф. станцыя швейная майстэрня, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, спажывецкае т-ва. У 2007 г. цэнтр СВК “Усход”, школа, магазін, аддз. сувязі. Зараз ААТ “Сцяг працы”.

На 01.01.2024 насельніцтва складае 134 чал.

**КАСМЫНІЧЫ** – вёска ў Капачоўскім с/с, за 15 км на ПнЗ ад Мсціслава, 85 км ад Магілёва, 17 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Упершыню згадваецца ў фрагментах інвентару 1560, калі вёска была дзярж. уласнасцю і налічвала 5 дамоў. У 1604 г. сяло ў Гарбавіцкім войтаўстве Магілеўскага староства-эканоміі. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-67 гг. спустошана ў выніку ваен. дзеянняў. У 1768 г. тут быў маёнтак. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1850 г. ў Мсціслаўскім павеце, 9 двароў, 41 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1881 г. памешчыкі Карачэўскія мелі ў вёсцы 192 дзес. зямлі. паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета, 21 двор, 140 жыхароў. Побач была аднайменная аколіца, 23 двары,145 жыхароў. У 1909 г. ў вёсцы 42 двары, 158 жыхароў, у аколіцы – 19 двароў, 70 жыхароў. У гэтым жа годзе была адкрыта земская школа, для якой пабудавана памяшканне. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 42, а ў 1926 г. – 65 вучняў. У 1926 г . ў вёсцы 69 двароў, 342 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас “Пралетарская перамога”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 60 гаспадарак, меў 322 га ворыва, абслугоўся Хлышчоўскай МТС. У 1935 г. пач. школаператворана ў 7-гадовую. З 20.02.1938 г.ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 61 гаспадарка, 169 жыхароў, у складзе племсаўгаса “Пісараўшчына” (цэнтр – в. Капачы). Працавалі 8-гадовая школа, клуб, магазін, фельч.-акушэрскі пункт, аддз. сувязі. У 2007 г. вёска далучана да РУСП “Селекцыйна-гібрыдны цэнтр “Віхра”. Дзейнічаў магазін.

На 01.01.2024 насельніцтва складае 31 чал.

**КАСЬКОВА** – вёска ў Ряцанцевском  с/с, за 10 км на ПнУ ад Мсціслава, 105 км ад Магілёва, 29 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 18 с. У 1785 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, 36 двароў, 262 жыхары, уласнасць памешчыка. Пасля 3–га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у складзе Рас. імперыі. У 1850 г. вёска Качуры (яна ж Каськова) у Мсціслаўскім павеце, дзярж. ўласнасць. У 1858 г. ў складзе маёнтка Рыкава Мсціслаўскага павета. Паводле перапісу 1897 г. ў Аслянскай вол. Мсціслаўскага павета, 48 двароў, 298 жыхароў, школа граматы. Непадалёку ад тракта Мсціслаў – Хіславічы была сядзіба – 1 двор, 1 жыхар, піцейны дом. У 1909 г. 51 двор, 359 жыхароў. З 1918 г. да 1964 г. ў Хіславіцкім р-не Смаленскай вобл. РСФСР. У 1923 г. адкрыта прац. школа 1-й ступені. У 1931 г. арганізаваны калгас. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупірвана ням.–фаш. захонікамі. У 1990 г. 63 гаспадаркі, 130 жыхароў, у складзе калгаса "Савецкая Расія" (цэнтр – в. Сапрынавічы). Працавалі пач. школа, магазін. У 2007 г. ў СВК "Кастрычнік". У вёскі быў магазін. Зараз ААТ "Кастрычнік".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 26 чал.

**КОЛТАВА –** вёска ў Сялецкім с/с, за 14 км на Пд ад Мсціслава, 109 км ад Магілёва, 22 км ад чыг. ст. Крычаў на лініі Орша-Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1620 г. фальварак, уласнасць памешчыка. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1858 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, 99 рэвізскіх душ, мелася карчма. У 1885 г. сяло ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., 34 двары, 235 жыхароў. Дзейнічала царква (адкрыта не пазней 1880 г.), рэшткі якой захаваліся да нашых дзён. Паводле перапісу 1897 г. 55 двароў, 348 жыхароў, царк.-прыходская школа. У 1909 г. 380 жыхароў. Побач быў аднайменны фальварак, 11 двароў, 92 жыхары. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 103 вучня. Працаваў гурток па ліквідацыі непісьменнасцісярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас "Звязда", які ў 1932 аб'ядноўваў 61 гаспадарку, меў 340 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. У 1931 г. яму было перададзена ўрочышча Слабодка. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 38 двароў, 202 жыхары. У Вял. Айч. вайну з 17.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г.поўнасцю спалілі вёску, загубілі 1 жыхара. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 26 гаспадарак, 50 жыхароў, у складзе калгаса імя Чапаева (цэнтр – в. Сялец). У 2007 г. ў СВК імя Чапаева. Зараз у складзе ААТ "Сож-Агра".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 5 чал.

**КУРКАЎШЧЫНА** – вёска ў Мазалаўскім с/с, за 4 км на ПдЗ ад Мсціслава, 92 км ад Магілёва, 14 км ад чыг. ст.Ходосы на лініі Орша-Сураж.

За 0,1 км на Пн ад вёскі захавалася гарадзішча ранняга жал. веску, якое сведчыць аб засяленні гэтых месц у глыбокай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з пач. 19 ст. У 1825 г. 7 двароў, уласнасць царквы. У

1858 г. вёска Куркаўшчына ў Мсціслаўскім павеце, 18 жыхароў мужчынскага полу, уласнасць памешчыка. У 1909 г. аколіца ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 10 двароў, 117 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1926 г. 15 двароў, 142 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Кірава, які з 1933 г. абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 46 двароў, 149 жыхароў. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У 1956 г. далучана в. Татаршчына. У 1990 г. 32 гаспадаркі, 76 жыхароў, ў складзе саўгаса "Мсціслаўскі" (цэнтр – г. Мсціслаў). У 2007 г. вёска далучана да СВК "Мазалаўскі" . Зараз ААТ "Мазалаўскі".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 21 чал.

**КУРМАНАВА** – вёска ў Падсолтаўскім с/с, за 28 км на ПнЗ ад Мсціслава, 123 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Цёмны Лес на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. як маёнтак Курманава. У 1825 г. тут заснаваны сукнавальня і вінакурная вытворчасць (у 1881 г. 9 рабочых). У 1857 г. вёска і фальварак у Мсціслаўскім павеце. У 1860 г. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка, уласнасць памешчыка, якая мела тут у 1877 г. 6295 дзес. зямлі, вінакурны з-д, 2 млыны, сукнавальню і 2 карчмы. У 1880 г. ў Шамаўскай вол., 23 двары, 161 жыхар. Паводле перапісу 1897 г. 34 двары, 222 жыхары, у фальварку – 71 двор. Дзейнічалі млын, сукнавальня, піцейны дом. У снеж. 1905 г. прыбыўшы з Масквы на радзіму селянін М. Старчакоў вёў рэв. прапаганду, заклікаў да паўстання. У 1909 г. ў вёсцы 39 двароў, 254 жыхары, у фальварку – 29 жыхароў. У чэрв. 1917 г. сяляне, што выконвалі пастанову вал. к-та, забралі ў памешчыцы маёнтак, падзялілі зямлю, рэквізавалі 85 галоў жывёлы, высеклі вял. надзел лесу. У 1923 г. адкрыта прац. школа 1-й ступені. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. З 20.08.1924 г. да 20.02.1938 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. створана закупачна-збытавое с.-г. крэдытнае т-ва. У 1929 г. арганізаваны саўгас "Чырвоны сцяг", які ў 1933 г. меў 4 трактары і іншую с.-г. тэхніку. У вёсцы быў таксама калгас "VI з'езд Саветаў Мсціслаўшчыны", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 36 гаспадарак, меў 172 га ворыва. У 1937 г. на базе скасаванага саўгаса створана Курманаўская МТС (рэарганізавана 31.03.1958 г.), адкрыты дзіцячыя яслі, дзейнічалі цагельны і лёнаапрацоўчы з-ды. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл.З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну 14.07.1941 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. Вызвалена 29.09.1943 г. часцямі 277-й стралк. дывізіі. У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса, на ўшанаванне памяці 220 землякоў, якія загінулі на фронце і ў партыз. барацьбе, у 1968 г. пастаўлены абеліск. У 1990 г. 127 гаспадарак, 291 жыхар, цэнтр калгаса Леніна, які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі. Меў 4841 га сельгасугоддзяў. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, сярэдняя і муз. школы, б-ка. Дом культуры, бальніца, аптэка, урачэбная амбалаторыя, сталовая, прадуктовы і прамтаварны магазін,

комплексны прыёмны пункт быт.абслугоўвання насельніцтва, швейная мастэрня, аддз. сувязі, аўтаматычная тэлеф. станцыя. У 2007 г. цэнтр СВК "Курманава". Зарат ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 177 чал.

**ЛАСТРЫГІНА** – вёска ў Краснагорскім с/с, за 21 км на Пд ад Мсціслава, 116 км ад Магілёва, 22 км ад чыг. ст. Крычаў на лініі Орша-Сураж.

Замсн. ў 1920-я г. на былых памешчыцкіх землях. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Чырвонага Кастрычніка, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 24 гаспадаркі, меў 119 га зямлі, з 1933 г. яго абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 17.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 14 гаспадарак, 32 жыхары, у складзе імя Чапаева (цэнтр – в. Сялец). У 2007 г. ў СВК імя Чапаева. Зараз ААТ "Сож-Агра".

На 01.01.202 насельніцтва складае 0 чал.

**МАЗАЛАВА** – вёска, цэнтр Мазалаўскага с/с, за 10 км на ПдЗ ад Мсціслава, 85 км ад Магілёва, 9 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

За 0,8 км на Пд ад вёскі, на высокім правым беразе р. Белая Натапа, захавалася гарадзішча (мясц. назва Тарэлка) мілаградскай і зарубінецкай культур і эпохі Кіеўскай Русі, датуецца 7 ст. да н.э. – 2 ст. н.э. і 12-12 ст. На паўд. баку ад гарадзішча знаходзіцца селішча. Гэтыя археал. помнікі сведчаць аб засяленні тутэйшых месц у глыбокай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1615 г. вёска Мазалаўшчына ў Мсціслаўскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1665 г. тут пабудаваны Спаса-Праабражэнскі праваслаўны жаночы манастыр, які ў 1743 г. стаў уніяцкім , а з 1778 г. адноўленны як праваслаўны (зараз з'яўляецца помнікам архітэктуры). Пры манастыры працавала школа ВКЛ. Пасля 1-га падзелу рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас.імперыі. У пач. 19 ст. на зах. ускраіне вёскі пабудавана з цэглы Ушэсцеўская царква, якая з'яўляецца помнікам архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. У 1880 г. засн. крупадзёрка. У 1885 г. сяло, 18 двароў, 148 жыхароў, дзейнічалі 2 царквы, жаночы манастыр, вадзяны млын. Паводле перапісу 1897 г. сяло ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета, каля гандл. тракта Мсціслаў – Чавусы, 27 двароў, 191 жыхар, 2 разы ў год праводзіліся кірмашы. У манастыры ў гэты час 10 двароў, 89 жыхароў, царк.-прыходская школа, на сядзібе – 1 двор, 7 жыхароў, вадзяны млын. У 1910 г. пры мужчынскім манастыры працавала амбулаторыя. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1924 г. засн.саўгас-камуна "Мазалава". У 1925 г. адкрыта школа, якая размяшчалася ў адным з манастырскіх будынкаў (у 1926 г. вучняў). З 21.08.1925 г. цэнтр сельсавета. Дзейнічала хата-чытальня, фельч.-акушэрскі пункт. У 1926 г. 52 двары, 323 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Ягорава, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 22 гаспадаркі, меў 270 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай

МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 87 двароў, 415 жыхароў, у вёску перавезены бліжэйшыя хутары. У Вял.Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. спалілі 78 двароў. Пасля вайны адбудавана. У 1969 г. ў цэнтры вёскі, каля будынка сярэдняй школы, на ўшанаванне памяці 153 землякоў, што загінулі на франтах і ў партыз. барацьбе, узведзены абеліск. У 1990 г. 211 гаспадарак, 651 жыхар, цэнтр калгаса "60 гадоў БССР", які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі і вырошчванні тэхн. культур, меў 4485 га с.-г. угоддзяў. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, 8-гадовая школа, б-ка, Дом Культуры, гандл. цэнтр, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, фельч.-акушэрскі пункт, сталовая, аддз. сувязі, аўтаматычная тэлеф. станцыя, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, ветэрынарны ўчастак і аптэка. У 2007 г. цэнтр СВК "Мазалаўскі", сярэдняя агульнаадукац. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, Мсціслаўскага УКП "Бытпаслугі", адз. сувязі.

На 01.01.2024 насельніцтва складае 694 чал.

**МАЛЬКАЎКА** – вёска ў Ракшынскім с/с, за 37 км на ПнЗ ад Мсціслава, 70 км ад Магілёва, 19 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1635 г. вёска Малькава ў Пуцькаўскім войтаўстве Магілёўскай эканоміі Аршанскага павета, дзярж. уласнасць, мелася царква. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. Паводле перапісу 1897 г. ў Доўгавіцкай вол. Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губ., 48 двароў, 276 жыхароў. У 1909 г. 60 двароў, 510 жыхароў. У 1910 г. адкрыта школа (нар. вучылішча). З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэв. створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. быў 61 вучань. 14.01.1926 г. арганізавана закупачна-бытавое т-ва. У 1926 г. 75 двароў, 544 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас "Чырвоны трактар", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 58 гаспадарак, меў 689 га зямлі. Абслугоўвала яго Ходасаўская МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 28.09.1943 акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 29 гаспадарак, 73 жыхары, у складзе калгаса "Ударнік" (цэнтр – в. Доўгавічы), працаваў магазін. У 2007 г. вёска далучана да СВК "Усход". Зараз ААТ "Знамя труда".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 14 чал.

**МУШЫНА** – вёска, цэнтр Мушынскага с/с, за 12 км на ПдЗ ад Мсціслава, 88 км ад Магілёва, 13 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша-Сураж.

Засн. ў пачатку 1930-х г. як цэнтр. сядзіба саўгаса "Перамога", які ўваходзіў у Аршанскі свінагадоўчы трэст, меў у 1935 г. 7 трактароў і іншую тэхніку. У 1933 г. адкрыты дзіцячыя яслі. У 1934 г. вёска атрымала тэлеф. сувязь, у 1935 г. – электрычнасць. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940

г. працавалі клуб, бальніца, аптэка. З ліп. 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У пач. Вял. Айч. вайны ў ліп. 1941 г. з саўгаса была эвакуіравана ў Разанскую і Пензенскую вобласці буйная рагатая жывёла (301 галава), у Тамбоўскую вобл. – коні (23 галавы). У 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адбудаваны У цэнтры вёскі  на ўшанаванне памяці 248 землякоў – воінаў і партызан, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, у 1968 г. пастаўлены помнік. У 1944 г. саўгас атрымаў з Омскай вобл. 110галоў буйной рагатай жывёлы. З 18.11.1966 г. цэнтр сельсавета. У 1990 г. 198 гаспадарак, 593 жыхары, цэнтр саўгаса "Перамога", які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі і насенняводстве. Меў 6344 сельгасугоддзяў, у тым ліку 4496 га ворыва, 39 грузавых аўтамашын, 77 трактароў, 18 збожжаўборачных, 4 ільнаўборачных, 9 бульбаўборачных камбайнаў і іншую тэхніку. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, ветэрынарная аптэка, швейная і шавецкая майстэрні, 2 магазіны, сталовая, грамадзянская лазня, комплексны прыёмны пункт быт. Абслугоўвання насельніцтва, аўтаматычныя тэлеф. станцыя, аддз. сувязі. У 2007 г. цэнтр СВК "Мушына", дзіцячы сад, сярэдняя школа, клуб, б-ка, фелльч.-акушэрскі пункт, магазін, комплексны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, філіал Мсціслаўскага УКП "Бытпаслугі".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 320 чал.

**МЫШКІНА** – вёска ў Мазалаўскім с/с, за 12 км на ПдЗ ад Мсціслава, 88 км ад Магілёва, 13 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1690 г. як вёска ў валоданні памешчыка. У 1708 г. ўласнасць Мсціслаўскага кармеліцкага кляштара. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. Памешчык у 1833 г. меў у вёсцы 121 дзес., а ў 1875 г. – 381 дзес. зямлі. У 1858 г. ў Мсціслаўскім павеце, 60 рэвізскіх душ, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 21 двор, 158 жыхароў. Побач былі 3 аднайменныя фальваркі (па 1 двары) і 2 сядзібы (1 двары).  У 1909 г. 23 двары, 184 жыхары. У 1918 г. адкрыта школа, якой быў перададзены былы памешчыцкі будынак. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1925 г. ў школе навучаліся 38 вучняў. У 1931 г. арганізаваны калгас "Новае жыццё", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 12 гаспадарак, меў 113 га зямлі. З 1933 г. яго абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 40 двароў, 132 жыхары. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. спалілі вёску (38 дамоў). Пасля вайны адбудавана. У 1976 г. далучана в. Жарацiно. У 1990 г. 48 гаспадарак, 122 жыхары, у складзе калгаса "60 гадоў БССР" (цэнтр – в. Мазалава), працаваў магазін. У 2007 г. ў СВК "Мазалаўскі". Зараз ААТ "Мазалаўскі".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 22 чал.

**НОВАЕ СЯЛО** – вёска ў Мазалаўскім с/с, за 13 км на ПдЗ ад Мсціслава, 84 км ад Магілёва, 6 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 17 ст. У 1690 г. вёска, валоданне памешчыка. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1834 г. сяло ў Мсціслаўскім павеце, 63 двары, 364 жыхары. У 1852 г. ў складзе маёнтка Залачова Мсціслаўскага павета, мелася карчма. У 1885 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 77 двароў, 501 жыхар, драўляная царква. Паводле перапісу 1897 г. 97 двароў, 807 жыхароў, хлебазапасны магазін. Побач была аднайменная царк. сядзіба (2 двары, 7 жыхароў). Дзейнічала царк.-прыходская школа. У 1909 г. 134 двары, 919 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У вясковай школе ў 1926 г. было 144 вучні. Працаваў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 190 двароў, 1082 жыхары. У сак. 1931 г. арганізаваны калгас імя Гея, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 138 гаспадарак, меў 897 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана; мелася кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш.захопнікамі. У 1990 г. 112 гаспадарак, 269 жыхароў, у складзе калгаса "60 гадоў БССР" (цэнтр – в. Мазалава). Працавалі пач. школа, б-ка, клуб, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, магазін. У 2007 г. вёска ў СВК "Мазалаўскі", магазін. Зараз ААТ "Мазалаўскі".

На 01.01.2024 насельніцтва складае 36 чал.

**ПАЦКАВА** – вёска ў Падсолтаўскім с/с, за 25 км на ПнЗ ад Мсціслава, 95 км ад Магілёва, 19 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1685 г. засн. дамініканскі кляштар, якому належылі сёлы Пацкаў і Млынцы. У 1737 г. мелася царква. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1784 г. ўвалоданні памешчыка. У 1834 г. ў Мсціслаўскім павеце, 40 двароў, 284 жыхары. Паводле перапісу 1897 г. вёскі Вялікае Пацкава (45 двароў, 252 жыхары, піцейны дом) і Малое Пацкава (25 двароў, 176 жыхароў) у Шамаўскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ. Побач фальварак – 1 двор, 29 жыхароў, вадзяны млын, сукнавальня (засн. ў 1780). Апрача земляробства вяскоўцы займаліся валеным, кравецкім, калёсным, сталярным, ганчарным і кавальскім промысламі. У 1909 г. ў Вялікае Пацкава 51 двор, 294 жыхары, у в. Малое Пацкава – 26 двароў, 163 жыхары, у фальварку – 1 двор, 20 жыхароў. У 1910 г. адкрыта земская школа. Вясковец А. Агееў быў арганізатарам вал. атрада Чырвонай гвардыі. З 17.07.1924 г. вёска ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. навучаліся 68 вучняў. У 1931 г. ў в. Вялікае Пацкава арганізаваны калгас "Савецкая Беларусь" (у 1932 г. аб'ядноўваў 34 гаспадаркі, меў 148 га ворыва), у в. Малое Пацкава – калгас "Бальшавік" (у 1932 г. 36 гаспадарак, 150 га ворыва). Гаспадаркі мелі свае кузні, абслугоўваліся Курманаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 29.09.1943 г. вёскі акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. У 1976 г. Вялікае

Пацкава і Малое Пацкава аб’яднаны ў адну в. Пацкава, якая з 1950-х г. у складзе калгаса імя Леніна (цэнтр – в. Курманава). У 1990 г. 69 гаспадарак, 140 жыхароў. Працавалі б-ка, клуб, комплексны прыемны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, магазін. У 2007 г. вёска ў СВК “Курманава”. Дзейнічаў магазін. Зараз ААТ “Натапа-Агра”.

На 01.01.2024 наслеьніцтва складае 21 чал.

**ПІРАГОВА** – вёска ў Мушінскім с/с, за 10 км на ПдЗ ад Мсціслава, 94 км ад Магілёва, 13 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 16 ст. У 1510 г. сяло ў Мсціслаўскім княстве,шляхецкая ўласнасць. У 1684 г. ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, уласнасць памешчыка. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1781 г. мелася царква. У 1825 г. ўласнасць царквы. У 1852 г. сяло ў складзе маёнтка Залачэва, уласнасць памешчыка, які меў тут у 1868 г. 101 дзес. зямлі. У 1885 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 38 двароў, 216 жыхароў. У 1896 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. Паводле перапісу 1897 г. 44 двары, 322 жыхары. Побач былі аднайменныя царк. сядзіба (2 двары, 10 жыхароў) і 2 фальваркі (2 двары 2 жыхары). У 1909 г. сяло, 31 двор, 187 жыхароў, і 2 фальваркі – 2 двары, 7 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана прац. школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 40 вучняў, мелася б-ка. У 1926 г. вёска (85 двароў, 439 жыхароў) была падзелена на дзве. У 1931 г. ў в. Вялікае Пірагова арганізаваны калгас “Ударная праца”, у 1932 г. аб’ядноўваў 45 гаспадарак, меў 374 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. У в. Малое Пірагова быў створаны калгас імя Леніна, у 1932 г. 17 гаспадарак, 110 га зямлі, дзейнічала кузня. У канцы 1930-х г. Вялікае Пірагова і Малое Пірагова аб’ядналіся ў адну в. Пірагова. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 45 двароў, 141 жыхар. У Вял. Айч. вайну з 15.07.1941 г. да 3.10.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. спалілі 39 дамоў. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 16 гаспадарак, 47 жыхароў, у складзе саўгаса “Перамога” (цэнтр – в. Мушына). У 2007 г. вёска ў СВК “Мушана”. Зараз ААТ “Мушана-Агра”.

На 01.01.2024 насельніцтва складае 21 чал.

**ЧАРНІЛАВА** – вёска ў Капачоўскім с/с, за 12 км на ПнЗ ад Мсціслава, 107 км ад Магілёва, 31 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша Сураж.

За 2 км на З ад вёскі знаходзіцца стараж. курган, які сведчыць аб засяленні месц у далёкай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з 1660 г. ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У час вайны Рассіі з Рэччу Паспалітай 1654-67 гг. спустошана ў выніку ваенных дзеянняў. Памешчык меў тут у 1879 г. 198 дзес. зямлі. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета, 16 двароў, 72 жыхары. Побач быў аднайменны фальварак, 1 двор, 3 жыхары. У 1909 г. ў сяле 19 двароў, 73 жыхары, у фальварку 1 двор, 7 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У

1931 г. арганізаваны калгас імя Будзённага, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 25 гаспадарак, меў 184 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 57 гаспадарак, 136 жыхароў, у складзе Мсціслаўскага коннага з-да №120 (цэнтр – в. Лютня). Працавалі клуб, магазін. У 2007 г. вёска ў РУСП “Селекцыйна-гібрыдны цэнтр “Віхра”.

На 01.01.2019 насельніцтва складае 32 чал.

**ШУМЯНІЧЫ** – вёска ў Краснагорскім с/с, за 3 км на ПдУ ад Мсціслава, 98 км ад Магілёва, 22 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 18 ст. У 1785 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, 8 двароў, 47 жыхароў, уласнасць памешчыка, які меў у вёсцы ў 1868 г. 110 дзес. зямлі. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 18 двароў, 139 жыхароў. Побач былі 2 фальваркі (разам 2 двары, 22 жыхары). У 1909 г. ў вёсцы 18 двароў, 136 жыхароў, у 2 фальварках – 2 двары, 15 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас “Шлях Леніна”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 29 гаспадарак, меў 226 га зямлі, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. 40 двароў. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 да 29.09.1944 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў 1943 г. поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 30 гаспадарак, 67 жыхароў, у складзе калгаса “1 Мая” (цэнтр – в. Каробчына). У 2007 г. вёска ў СВК “Сож-Агра”. Зараз ААТ “Сож-Агра”.

На 01.01.2024 насельніцтва складае 31 чал.

**ЯНАЎКА** – вёска ў Сапрынавіцкім с/с, за 4 км на ПнУ ад Мсціслава, 99 км ад Магілёва, 23 км ад чыг. ст. Ходасы на лініі Орша – Сураж.

У пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца пад 1960 г. ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ як уладанне памешчыка. У 1834 г. ў Мсціслаўскім павеце, 6 двароў, 16 жыхароў, уласнасць памешчыка, які меў тут 1850 г. 254 дзес. зямлі. Паводле перапісу 1897 г. вёска Янава Слабада ў Аслянскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., 16 двароў, 102 жыхары. У 1909 г. вёска Янаўка ў Сінскай вол. Мсціслаўскага павета, 20 двароў, 100 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. З 20.08.1924 г. да 20.02.1938 г. цэнтр сельсавета. У 1931 г. арганізаваны калгас “Маяк”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 32 гаспадаркі, меў 168 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 34 гаспадаркі, 74 жыхары, у складзе калгаса “Савецкая Расія” (цэнтр – в. Сапрынавічы). У 2007 г. вёска ў СВК “Кастрычнік”. Зараз ААТ “Кастрычнік”.

На 01.01.2024 насельніцтва складае 13 чал.

**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год**
**Мсціслаўскі раён**

Бібліяграфічны паказальнік

складальнік Хмуровіч Святлана Віктараўна

адказны за выпуск Н. В. Сідарэнкава

Дзяржаўная ўстанова культуры
“Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”

213453 г. Мсціслаў вул. Пралятарская, 36
Тэлефон (02240)44870
Эл. пошта: Mstislavl_bib@mail.ru